# Моўны марафон: алімпіядныя заданні па вучэбных прадметах “Беларуская мова” і “Літаратурнае чытанне” (4 клас)

**Наталля Уладзіміраўна Хмялеўская,**
настаўнік пачатковых класаў
вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі
Махнавіцкая сярэдняя школа Мазырскага раёна,
**Ала Мікалаеўна Церах,**
настаўнік пачатковых класаў
вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі
Махнавіцкай сярэдняй школы Мазырскага раёна

**Правядзенне алімпіяд з’яўляецца неад’емнай часткай работы настаўніка пачатковых класаў. З іх дапамогай настаўнік мае магчымасць выявіць інтэлектуальны патэнцыял навучэнцаў, павысіць цікавасць да вучэбных прадметаў, пашырыць кругагляд. Прапанаваны моўны марафон уключае тры туры. Працягласць выканання заданняў кожнага тура – 60 хвілін.**

**Задачы:** стварыць умовы для развіцця інтэлектуальных і творчых здольнасцей, пазнаваўчай актыўнасці вучняў; садзейнічаць развіццю ўвагі, мыслення, кемлівасці; выхоўваць цікавасць да моўнага багацця роднай мовы.

## І тур

1. **Дапоўні тэкст лікамі, якіх не хапае.**
   Сучасны беларускі алфавіт складаецца з ___ літар.
   ___ галосных літар служаць для абазначэння ___галосных гукаў.
   У беларускай мове ___ зацвярдзелых гукаў.
   ___ літары беларускага алфавіта, якіх няма ў рускім алфавіце.
2. **Запішы словы ў алфавітным парадку.**
   Крот, кабан, куніца, кіт, кракадзіл, карова, казуля, кенгуру, камар, краб, какаду, кашалот.
3. **Разгадай крыжаванку са слоўнікавых слоў.**

ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

1) Доля мінуты.
2) Будзе і на нашай ... свята.
3) Кроплі вады, якія падаюць з хмар.
4) Той, хто плавае.
5) Ловіць мух у сваёй сетцы.

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | 1. **с** | | | | | | |
| | 2. | | **л** | | | | | | |
| | | 3. | **о** | | | | | | |
| 4. | | | **в** | | | | | | |
| | | 5. | **а** | | | | | | |

**4. Падкрэслі правільныя варыянты перакладу слоў з рускай мовы на беларускую.**

Ковёр – дыван, тыква – кавун, цветок – кветка, июль – чэрвень, бусы – пацеркі, мечта – мара, облако – хмара.

**5. Выпраў памылкі ў выдзеленых словах.**

Дараваў **дачке**, прачытаў у **кніге**, пайсці **па** грыбы, гулялі па **вуліцам**, раслі ў **поле**, заплакала ад **болі**, дайшлі да **луга**, мяч для **футболу.**

**6. Ад дзеясловаў утвары назоўнікі.**

Калыхаць – ______________, думаць – ______________, аб’яднаць – ______________, правяраць – ______________, слухаць – ______________, хварэць – ______________, варажыць ______________.

**7. Выпішы з рада слоў спачатку аднакаранёвыя словы, а потым формы аднаго і таго ж слова.**

Лес, ляснічы, леснікі, ляснік, лясны, лесвіца, лесніком, лясніцтва, лесніку, лесавік, лесніка, узлесак, прылезці.

**8. Узнаві прыказкі па апорных словах.**

Маці – Радзіма.
Нарадзіўся – прыгадзіўся.
Павядзешся – набярэшся.
Жыць – не тужыць.
Слова – дзень.
Жыццё – поле.
Катацца – вазіць.

NG press ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

**9. Успомні і запішы прозвішчы знакамітых людзей Беларусі, якія складаюцца з двух, трох, чатырох складоў (па два).**

**10. Па пачатку ўспомні і запішы назву беларускай народнай казкі.**

1. Жыў некалі на свеце адзін музыка. Пачаў ён іграць яшчэ змалку.
2. Даўней было так: як састарэе бацька, то сын завязе яго ў глухую пушчу ды і пакіне там.
3. Былі ў аднаго чалавека два сыны. Як выраслі яны, бацька сказаў:
   – Пара, сыны, за сталую работу брацца. Хто з вас чым хоча заняцца?
4. Жыў адзін цікаўны хлопец Андрэй. Хацеў ён усё ведаць.
5. Жылі-былі коцік і пеўнік. Добра жылі, дружна. Коцік на паляванне хадзіў, а пеўнік есці варыў, хатку падмятаў, песні спяваў.

| № | Адказы | Колькасць балаў |
|---|---|---|
| 1 | 32 літары; 10 галосных літар, 6 галосных гукаў; 6 зацвярдзелых гукаў; 3 літары. | 4 балы (па 1 бале за правільны адказ) |
| 2 | Кабан, казуля, какаду, камар, карова, кашалот, кенгуру, кіт, краб, кракадзіл, крот, куніца. | 6 балаў (па 0,5 бала за правільны адказ) |
| 3 | Секунда. Вуліцы. Дождж. Плывец. Павук. | 5 балаў (па 1 бале за слова) |
| 4 | Ковёр – дыван, цветок – кветка, бусы – пацеркі, мечта – мара. | 4 балы (па 1 бале за правільны адказ) |
| 5 | Дараваў дачцэ, прачытаў у кнізе, пайсці ў грыбы, гулялі па вуліцах, раслі ў полі, заплакала ад болю, дайшлі да лугу, мяч для футбола. | 4 балы (па 0,5 бала за выпраўленую памылку) |
| 6 | Калыска. Думка. Аб’яднанне. Праверка. Слухач. Хвароба. Варажба. | 7 балаў (па 1 бале за слова) |
| 7 | Лес, ляснічы, лясніцтва, лесавік, узлесак.<br>Ляснік, леснікі, лесніком, лесніку, лесніка. | 5 балаў (па 0,5 бала за правільны варыянт) |
| 8 | Адна ў чалавека маці, адна ў яго і Радзіма. Дзе нарадзіўся, там і прыгадзіўся.<br>З кнігай павядзешся – розуму набярэшся.<br>З кнігаю жыць – век не тужыць.<br>Ласкавае слова што дзень ясны.<br>Жыццё пражыць – не поле перайсці.<br>Любіш катацца – любі і саначкі вазіць. | 7 балаў (па 1 бале за прыказку) |

| | | |
|---|---|---|
| 9 | Сымон Будны, Яраслаў Мудры; Кірыла Тураўскі, Францыск Скарына; Ефрасіння Полацкая, Францішак Багушэвіч. | 6 балаў (па 1 бале за правільны адказ) |
| 10 | “Музыка-чарадзей”.<br>“Стары бацька”.<br>“Ад крадзенага не пасыцееш”.<br>“Андрэй за ўсіх мудрэй”.<br>“Коцік, пеўнік і лісіца”. | 5 балаў (па 1 бале за назву казкі) |
| Максімальная колькасць балаў – 53 | | |

## II тур

1. **Якое слова задумана?**

Першы гук у слове – [...] – трэці гук у слове *дуб*.
Другі гук у слове – [...] – націскны гук у слове *фартух*.
Трэці гук у слове – [...] – сёмы гук у слове *сыраежка*.
Чацвёрты гук у слове – [...] – зацвярдзелы гук у слове *пчалавод*.
Пяты гук у слове – [...] – агульны гук у словах *мячык* і *гняздо*.

2. **Запішы назвы беларускіх рэк у алфавітным парадку.**

Тут Дняпро бяжыць прывольна,
Сож, Бярэзіна, Дзвіна,
Прыпяць, Шчара, Свіслач, Нёман,
Вілля, Піна, Буг, Дзісна.[1]

*М. Пазнякоў*

3. **Перастаў літары так, каб атрымаліся назвы школьных рэчаў. Запішы атрыманыя словы, перакладзі іх на рускую мову.**

Овалак – ______________– ______________,
дпілкзэн – ______________– ______________,
угмак – ______________– ______________,
брафы – ______________– ______________,
ндзёікн – ______________– ______________,
акстшы – ______________– ______________,
ніпакчдру – ______________– ______________.

4. **Ад прыметнікаў утвары назоўнікі, якія з’яўляюцца назвамі людзей.**

Багаты – _____________,
хітры – _____________,
шчаслівы – _____________,
вясёлы –_____________,
грубы – _____________,
смелы – _____________,

баязлівы – ____________.

**5. Разгадай і запішы слова, у якім:**

1) тая ж прыстаўка, што і ў слове *падказаць,*
   той жа корань, што і ў слове *ножык,*
   той жа суфікс, што і ў слове *ночка,*
   той жа канчатак, што і ў слове *вада.*
2) тая ж прыстаўка, што і ў слове *перагарэць,*
   той жа корань, што і ў слове *носік,*
   той жа суфікс, што і ў слове *грузчык,*
   той жа канчатак, што і ў слове *снег.*

**6. Падкрэслі назоўнікі, якія ў давальным і месным склонах маюць канчатак – і.**

Вяршыня, вёска, песня, птушка, дарога, гаспадыня, кветка.

**7. Выправі памылкі ў фразеалагізмах.**

Біцца як карась аб лёд; выйсці мокрым з вады; да шостага поту; пчала носа не падточыць; круціцца як заяц у коле; пусціць белага пеўня; як грэчку прадаўшы.

**8. Выпішы ўсе словазлучэнні са сказа (з пытаннямі).**

Пасля ўдалага палявання ліса ціха ляжала ў нары.

**9. Упішы ў пустыя клетачкі словы з 5 літар, якія пачынаюцца з літары *с*.**

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |
| | | | | |
| С | | | | |
| | | | | |
| | | | | |

Прыйдзе, тата, нашае_________.
Бацькоўскае _________ дарэмна не гаворыцца.
Колас добра не спее, калі _________ не грэе.
Якая справа, такая і _________.
На вуснах мёд, а на _________лёд.

**10. Выпішы прозвішчы беларускіх пісьменнікаў. Укажы іх імёны.**

Пушкін, Буйло, Карызна, Маршак, Броўка, Каліна, Купала, Гілевіч, Бунін, Ігнаценка.

| № | Адказы | Колькасць балаў |
|---|---|---|
| 1 | Пушча. | 1 бал за правільны адказ |

NG ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

| | | |
|---|---|---|
| 2 | Буг, Бярэзіна, Вілля, Дзвіна, Дзісна, Дняпро, Нёман, Піна, Прыпяць, Свіслач, Сож, Шчара. | 6 балаў (па 0,5 бала за правільны адказ) |
| 3 | Аловак – карандаш. Пэндзлік – кисточка. Гумка – стирка. Фарбы – краски. Дзённік – дневник. Сшытак – тетрадь. Падручнік – учебник. | 7 балаў (па 0,5 бала за правільны адказ) |
| 4 | Багач, хітрун, шчаслівец, весялун, грубіян, смяльчак, баязлівец. | 7 балаў (па 1 бале за правільны адказ) |
| 5 | Падножка. Пераносчык. | 2 балы (па 1 бале за слова) |
| 6 | Вяршыня, песня, гаспадыня. | 3 балы (па 1 бале за правільны адказ) |
| 7 | Біцца як рыба аб лёд; выйсці сухім з вады; да сёмага поту; камар носа не падточыць; круціцца як вавёрка ў коле; пусціць чырвонага пеўня; як пшаніцу прадаўшы. | 7 балаў (па 1 бале за правільны варыянт) |
| 8 | *Пасля* (чаго?) палявання; *ляжала* (як?) ціха; *ляжала* (дзе?) у нары; *палявання* (якога?) удалага. | 4 балы (па 1 бале за правільны адказ) |
| 9 | Свята, слова, сонца, слава, справе. | 5 балаў (па 1 бале за слова) |
| 10 | Канстанцыя Буйло, Уладзімір Карызна, Пятрусь Броўка, Клаўдзія Каліна, Янка Купала, Ніл Гілевіч, Рыгор Ігнаценка. | 7 балаў (па 1 бале за слова) |
| Максімальная колькасць балаў – 49 | | |

## III тур

1. **Колькі разоў сустракаецца гук [б’] у вершы В. Віткі “Бабры”.**

Дабёр бабёр, бабраняты – на падбор.
Малайцы бабры, нашых рэк гаспадары,
Вартавыя крыніц,
І куніц.
І суніц,
І лясоў, і ласёў,
І птушыных галасоў.
Хто заб’е бабра –
Не пабачыць дабра. [2]

NG ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

2. **Падкрэслі словы, у якіх націск падае на канчатак?**

Крапіва, баразна, медны, крама, зямля, страта, ярына, краса.

3. **Замяні выразы словамі з апострафам.**

Можа быць добрае, цёплае, дажджлівае.

Сінонім да слова афіша.

Перашкода на бегавой дарожцы.

Ахоўвае птушак ад дажджу.

Месца, дзе капаюць гліну і пясок.

Група зорак.

Усякае пустазелле.

4. **Запішы дадзеныя словазлучэнні адным словам-сінонімам.**

Ледзь чутная гутарка – ___________.

Сумка турыста – ___________.

Падземны транспарт – ___________.

Сахар у кавалачках – ___________.

Снежная бура – ___________.

Кучаравая ці завітая пасма валасоў – ___________.

Мыльная духмяная вадкасць для мыцця галавы – ___________.

5. **Расшыфруй рэбусы і запішы толькі назвы птушак.**









6. **Падкрэслі словы, якія з'яўляюцца назвамі страў беларускай нацыянальнай кухні.**

Жорны, аладкі, пранік, квас, чапяла, верашчака, грэбень, кулеш, праснакі, гарлач, клёцкі, прасніца.

7. **Замяні прыметнікі ў словазлучэннях сінонімамі з прыстаўкамі бяз-/бяс-, без -/бес-.**

Ціхія крокі – ____________________ крокі.

Невясёлы чалавек – ___________________ чалавек.

Правільны адказ – ___________________адказ.

Ясны дзень – ____________________дзень.

Смелы салдат – ____________________салдат.

8. **Запішы лічэбнік, які прапушчаны ва ўстойлівых спалучэннях.**

На … небе ад шчасця, падобныя як … кроплі вады, … вада на кісялі, іграць … скрыпку, працаваць да … поту, пагнацца за … зайцамі, як сабаку … лапа.

9. **Падбяры і запішы прыказкі да кожнай пары малюнкаў.**




ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА






**10. Размяркуй словы ў тры слупкі. У першы слупок запішы словы, якія адносяцца да свята "Вялікдзень", у другі слупок – да свята "Каляды", а ў трэці – да свята "Купалле".**

Яйка, зорка, тварожная пасха, куліч, каза, пачастунак, папараць-кветка, вянок, вогнішча.

| Вялікдзень | Каляды | Купалле |
|---|---|---|
| | | |

| № | Адказы | Колькасць балаў |
|---|---|---|
| 1 | Два. | 2 балы (па 1 бале за правільны адказ) |
| 2 | Крапіва, баразна, зямля, ярына, краса. | 5 балаў (па 1 бале за правільны адказ) |
| 3 | Надвор'е, аб'ява, бар'ер, пер'е, кар'ер, сузор'е, бур'ян. | 7 балаў (па 1 бале за слова) |
| 4 | Шэпт. Рукзак. Метро. Рафінад. Мяцеліца. Локан. Шампунь. | 7 балаў (па 1 бале за правільны адказ) |
| 5 | Варона, драч, зязюля. | 3 балы (па 1 бале за правільны адказ ) |
| 6 | Аладкі, квас, верашчака, кулеш, праснакі, клёцкі. | 6 балаў (па 1 бале за правільны адказ) |
| 7 | Бясшумныя крокі. Бязрадасны чалавек. Беспамылковы адказ. Бязвоблачны дзень. Бясстрашны салдат. | 5 балаў (па 1 бале за правільны адказ) |
| 8 | Сёмым. Дзве. Сёмая. Першую. Сёмага. Двума. Пятая. | 7 балаў (па 1 бале за правільны адказ) |

ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

| | | |
|---|---|---|
| 9 | Зімовы дзянёк, што камароў насок. Як ваўка не кармі, ён усё ў лес глядзіць. Усякай птушцы сваё гняздо міла. | 3 балы (па 1 бале за прыказку) |
| 10 | Вялікдзень: яйка, тварожная пасха, куліч.<br>Каляды: зорка, каза, пачастунак,<br>Купалле: папараць-кветка, вянок, вогнішча. | 9 балаў (па 1 бале за правільны адказ) |
| Максімальная колькасць балаў – 54 | | |

Літаратура

1. Аляксеева, В. Залатая раніца: казкі, апавяданні, вершы / В. Аляксеева. – Мінск : Звязда, 2015. – 240 с.

2. Апавяданні Васіля Віткі для дзяцей [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: karotkizmest.by – Дата доступу: 06.08.2025.

3. Жуковіч, М. В. Літаратурнае чытанне 4 клас, ч. 1 / М. В. Жуковіч, В. У. Праскаловіч. – Мінск : Акадэмія адукацыі, 2024. – 135 с.

4. Жуковіч, М. В. Літаратурнае чытанне 4 клас, ч. 2 / М. В. Жуковіч, В. У. Праскаловіч. – Мінск : Акадэмія адукацыі, 2024. – 135 с.

5. Капылоў, І. Л. Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы / І. Л. Капылоў. – Мінск : Беларусь, 2022. – 487 с.

6. Крынічка народнай творчасці : зборнік фальклорных твораў для дзяцей малодш. шк. узросту / склад. А. У. Івановіч, А. А.Сабіч. – Мінск : Беларусь, 2013. – 222 с.

ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА